## Што было напісана на пярсцёнку?

*Жыў-быў у адной дзяржаве мудры цар, быў у яго верны і любімы сябар. Перад смерцю цар сказаў свайму сябру: «Ты самы дарагі мне чалавек, і я хачу зрабіць табе падарунак — вазьмі з майго пальца пярсцёнак І, не чытаючы таго, што напісана на ўнутраным баку, надзень сабе на палец. Як бы цяжка табе ні было, пярсцё-нак не здымай. І толькі тады, калі ты не захочаш жыць, знімі пярсцёнак і прачытай надпіс».*

*Цар памёр. Жыццё яго сябра было цяжкае І невыноснае. Настаў момант, калі ён вырашыў скончыць жыццё самагубствам, пайсці назаўсёды*

*з жыцця.*
*Успомніў*
*на-каз цара,*
*зняў*
*пярсцёнак*
*і прачытаў надпіс:*

*« ……………………………………………………».*

**Конкурс «Прадоўжы прыказку, падабраўшы антонімы»**

*Настаўнік.* Нагадайце, калі ласка, што такое антонімы. *(Словы з процілеглым значэннем.)*

1. Адною рукою дае, а дзвюма ...

*2.* Адны пануюць, другія ...

3. Бацькаўшчыны не купляюць І не ...

4. Добрая слава людзей збірае, а......

5. Лепш адзін прыяцель, як дзесяць ...

6. Лёгка пасварыцца,......

7. Лета збірае, а ... праядае.

8. Слухай многа, а гавары ...

*9.* Здароўе лёгка страціць, ды ......

10. Па адзенні сустракаюць, а па розуму ...

***II конкурс* «Ці ведаеце вы?»**

*Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннем.*

1) агарод гарадзіць а) рабіць няўмела, абы-як

2) Богу душу аддаць б) пагрозліва, варожа ставіцца да каго-небудзь

3) валіць праз пень калоду в) памерці

4) за саломінку ўхапіцца г) задумваць, распачынаць справу, з якой многа

клопату

5) іграць першую скрыпку д) паспрабаваць выратавацца хоць якім, хоць і

ненадзейным спосабам

6) на злобу дня е) пад уладай

7) на мякіне не правядзеш з) быць галоўным у якой-небудзь справе

8) на хвост станавіцца к) перавага над іншымі, першае месца

9) пад ботам ё) быць галоўным у якой-небудзь справе

10) пальма першынства і) не перахітрыеш, не абдурыш, не ашукаеш

Адказы: 1г, 2в, 3а, 4д, 5ё, 6ж, 7і, 86, 9е, 10к.

***IV конкурс*** **«Устанаві адпаведнасць паміж рускімі і беларускімі фразеалагізмамі»**

1)держать ушки на макушке а) пераначуем — болей пачуем

2) у чёрта на куличках б) на першых часах

3) дать дрозда в) улезці як сучка ў збан

4) ни холодно ни жарко г) ні за што

5) не учи учёного д) каб цябе качкі затапталі

6) без царя в голове е) ні свярбіць ні баліць

7) попасть в переплёт ё) даць дыхту

8) забодай тебя комар ж) клёку ў галаве не мае

9) всяк сверчок знай свой шесток з) не вучы старога ката смятану злізваць

10) утро вечера мудренее і) за блізкім светам

**Адказы:** 1к,2і,3ё,4е,5з,6ж,7в,8д,9л,10а.